www.nv-online.info – электронны дадатак да друкаванай версіі газеты «Народная Воля».

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 42 (4294)

25 мая 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя сябры!
Не забудзьце падпісацца на “Народную Волю” на другую палову 2018 года!

УСІМ РАЗАМ ЗМАГАЦЦА ЗА МІР!

Такі лейтматыў міжнароднай канферэнцыі “Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх”, якая трэці дзень праходзіць у рамках форуму “Мінскі дыялог”.

БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

«Хельсінкі 2.0»: ідэя прывабная, але як яе рэалізаваць?

Зладжаная экспертнай арганізацыяй “Мінскі дыялог” чарговая канферэнцыя па міжнародных адносінах, якая трэці дзень праходзіць у нашай сталіцы, стала, бясспрэчна, найбольш буйной з тых, што праводзіла дадзеная структура за чатыры гады свайго існавання.

На гэты раз яна была гучна абвешчана як форум, і, нельга не прызнаць, небеспадстаўна. У яго рабоце ўзялі ўдзел каля паўтысячы чалавек, у тым ліку прыкладна дзвесце замежнікаў з дзясяткаў краін. Сярод спікераў – Генеральны сакратар АБСЕ **Томас Грэмінгер,** намеснік памочніка Генеральнага сакратара НАТА па палітычных пытаннях і палітыцы бяспекі **Джэймс Апатурай,** былы старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ **Крысцін Мутанен.** Нарэшце, вельмі актуальная ў сучасных абставінах была абрана тэма – “Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх”.

Паводле традыцыі, якая склалася, адкрываў форум міністр замежных спраў Беларусі **Уладзімір Макей.** Але, безумоўна, у якасці галоўнай падзеі ўсяго мерапрыемства адбылося выступленне прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **Аляксандра Лукашэнкі.** Лейтматывам яго прамовы можна лічыць сцвярджэнне, што “еўрапейская архітэктура бяспекі перажывае глыбокі сістэмны крызіс”. І сёння вельмі і вельмі актуальнай з’яўляецца прапанова аб падрыхтоўцы да так званага “Хельсінкі 2.0” – новага маштабнага міжнароднага дыялогу по пытаннях бяспекі. Гэтая ініцыятыва застаецца сёння галоўнай у знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі.

Каб прааналізаваць магчымасць яе рэалізацыі, варта нагадаць, што ўяўлялі сабой вынікі “Хельсінкі-1”, і чаму яны перасталі адпавядаць сённяшнім рэаліям. Адным з галоўных дасягненняў дамоўленасцяў 1975 года было прызнанне непарушнасці зафіксаваных на той час у Еўропе межаў у тым сэнсе, што ніводная дзяржава не мела права парушаць іх на сваю карысць. І, нягледзячы на тое, што шматлікія супярэчнасці паміж ваенна-палітычнымі блокамі – НАТА і Арганізацыяй Варшаўскага Дагавора, якія тады супрацьстаялі адзін аднаму, – захоўваліся і часам істотна абвастраліся, гэты прынцып заставаўся непарушным.

Праз паўтара дзесяцігоддзя на кантыненце, як вядома, адбыліся кардынальныя змены, што прывялі да аб’яднання Германіі і распаду Чэхаславакіі, Савецкага Саюза і Югаславіі. У першых двух выпадках гэта здарылася “аксамітна”, у другім – з адносна невялікай крывёй, у трэцім – вельмі крывава. Тым не менш згаданы прынцып усё роўна парушаны не быў – ніхто не павялічыў сваю тэрыторыю за кошт іншага.

Потым з дапамогай Захаду Косава аддзялілася ад Сербіі. Можна шмат спрачацца, наколькі легітымна гэта было ажыццёўлена, але пры ўсёй блізкасці Косава да Албаніі ў склад апошняй яно не ўвайшло. Дарэчы, менавіта гэты прыклад быў выкарыстаны Масквой для прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, але і тут, ва ўсялякім разе пакуль, фармальна яны застаюцца самастойнымі.

То бок падзел краіны збольшага ўжо прызнаны дапушчальным. А вось тое, што адбылося чатыры гады таму, змяніла сітуацыю радыкальна. Анексія Крыма Расіяй практычна знішчыла краевугольны камень Хельсінкскіх пагадненняў.

Канешне, на першы погляд самым простым выйсцем было б кіраўнікам усіх еўрапейскіх дзяржаў сабрацца разам са Злучанымі Штатамі і Канадай, каб адшукаць нейкі новы варыянт мірнага суіснавання. Вось толькі зусім незразумела, аб чым увогуле яны могуць дамовіцца.

Літаральна ўсе выступоўцы на форуме сцвярджалі, што ў аснове новых агульных пагадненняў павінен ляжаць кампраміс. Але пры гэтым непазбежна паўстае пытанне, ці магчымы ў прынцыпе хоць які-небудзь кампраміс, скажам, па Крыме. Насамрэч, бачацца толькі два варыянты: альбо Расія пакідае паўвыспу за сабой, альбо вяртае яе Украіне.

Апошняе, шчыра кажучы, на сённяшні дзень выглядае як нешта з вобласці фантастыкі. Крыху больш верагодным падаецца (хоць вельмі не хочацца ў гэта верыць), што раней ці пазней Захад, зыходзячы са сваіх меркантыльных меркаванняў, дэ-факта прызнае Крым расійскім – накшталт таго, як гэта мела месца ў адносінах да краін Балтыі ў савецкія часы.

Аднак стан спраў у свеце цяпер усё ж істотна адрозніваецца ад тых часоў, так што на фармальнае прызнанне анексіі Крамлю разлічваць наўрад ці варта. Тым больш Еўропа і ЗША мусяць разумець, што, патураючы агрэсару (а інакш сучасныя паводзіны Масквы характарызаваць не выпадае), яны будуць мець няшмат падстаў спадзявацца, што даволі хутка не прыйдзецца пераходзіць да “Хельсінкі 3.0”, “Хельсінкі 4.0” і г.д.

Такім чынам, пытанне, якое вынесена на разгляд форуму “Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх” мае надзвычай актуальны характар. Пра шляхі вырашэння вострых палітычных, эканамічных і іншых праблем і сёння працягваецца дыскусія на пляцоўцы форуму “Мінскі дыялог”. Пры гэтым самы небяспечны аспект заключаецца ў тым, што галоўная прычына многіх міжнародных канфліктаў знаходзіцца непасрэдна за нашымі ўсходнімі межамі, таму ў выніку абвастрэння канфрантацыі паміж Расіяй і Захадам можа паўстаць самая сапраўдная пагроза беларускай незалежнасці.

Янка СУДНІК.



СКАЗАНА!

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
«Беларусь не з Расіяй супраць Еўропы і не з Еўропай супраць Расіі»

– Любы разважлівы чалавек пацвердзіць, што сёння няма больш важнага пытання, чым захаванне міру і забеспячэнне яго ўстойлівага развіцця. Таму важна выпрацаваць і прадставіць палітыкам дакладныя прапановы, як гэта зрабіць з захаваннем інтарэсаў усіх бакоў. Яшчэ лепш, калі вашы ідэі будуць уздзейнічаць на шырокую грамадскую свядомасць. Для многіх людзей відавочна, што з моманту заканчэння халоднай вайны еўрапейская архітэктура бяспекі яшчэ не перажывала такога глыбокага сістэмнага крызісу.

***

– Беларусь – суверэнная дзяржава і дакладна ўсведамляе сваё становішча на міжнароднай восі каардынат. Мы не з Расіяй супраць Еўропы і не з Еўропай супраць Расіі і ўсяго Усходу. Для нас у прынцыпе непрымальнае пытанне, з кім мы. Проста наша становішча дае адказ на гэта пытанне. Мы гэта месца жыхарства беларускага народа не выбіралі – так Бог вызначыў. Адсюль наша і знешняя палітыка, і пазіцыя наогул.

***

– Знешнепалітычныя ініцыятывы Беларусі шырока і абсалютна вядомыя. Гэта пашырэнне ідэй партнёрства інтэграцыйных аб’яднанняў у Вялікай Еўропе, абнаўленне агульнаеўрапейскага дыялогу па ўмацаванні бяспекі і супрацоўніцтва. Яны з’яўляюцца лагічным адлюстраваннем аб’яднальнага парадку дня, які Мінск прапануе іншым членам сусветнай супольнасці.

***

– Апошнім часам нас пачынаюць папракаць, што мы нібыта рвёмся ў міратворцы. Мы нікуды не рвёмся. У нас сваіх праблем больш чым дастаткова. Але я ўжо сказаў аб нашай зацікаўленасці ў спакоі ва Украіне. Калі ва Украіне не будзе міру, будзе горача не толькі нам, але і ўсім вам. Гэты канфлікт як мага раней трэба не проста пагасіць – ліквідаваць. І ў гэтым вы можаце на нас разлічваць. Мы зробім усё, аб чым дамовяцца канфліктуючыя бакі.

***

– У выніку непрымірымасці пазіцый ключавых ігракоў менавіта сярэднія і малыя краіны атрымліваюць ўнікальную магчымасць ініцыіраваць прапановы па дыялогу і мерах даверу. Неабходна ёю скарыстацца, а не адыгрываць ролю статыстаў або саюзнікаў па ваенна-палітычных блоках, такіх як НАТА або АДКБ... Трэба ў добрым сэнсе парушыць манаполію дыялогу па гэтых пытаннях толькі паміж вялікімі краінамі.

***

– Для Беларусі адным з ключавых кампанентаў бяспекі быў і застаецца эканамічны. Гэты кампанент павінен быць пакладзены ў аснову ўсяго. Будзе развівацца эканоміка ў дзяржавах, будуць мець людзі рабочае месца, а значыць, і хоць нейкія даходы для таго, каб задаволіць свае патрэбнасці і сваёй сям’і, – будзе мір. Гэты падыход мы мэтанакіравана падтрымліваем на ўсіх узроўнях, уключаючы АБСЕ.

***

– Знаходзячыся на стыку Еўразійскага і Еўрапейскага саюзаў, Беларусь асабліва зацікаўлена ў іх узаемным збліжэнні. Трэба пераходзіць ад абстрактных размоў да канкрэтнага ўзаемадзеяння. Агульных інтарэсаў вельмі шмат: у эканоміцы, энергетыцы, экалогіі, гуманітарным супрацоўніцтве, транспарце, лагістыцы, у барацьбе з нелегальнай міграцыяй, трансгранічнай злачыннасцю, наркаманіяй, гандлем людзьмі і гэтак далей.

***

– Не павінны з’яўляцца новыя раздзяляльныя лініі, а ўрэгуляванне зацяжных канфліктаў можа адбывацца пры дапамозе шматбаковага эканамічнага супрацоўніцтва. Такую логіку неабходна проціпастаўляць тым, хто распаўсюджвае меркаванне, што Захад і Усход не патрэбны адзін аднаму.

***

– Сёння рэальнасцю стаў свет шматпалярны. Узрос уплыў іншых, нееўрапейскіх рэгіёнаў. Неабходна паступова пашыраць фармат дыялогу ў рамках АБСЕ. Прыцягваць да яго такіх ігракоў, як Індыя, Японія і, вядома, Кітай, які дзякуючы рэалізацыі сваёй ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях» паступова ператвараецца ў фактар еўрапейскай палітыкі, як бы камусьці гэтага не хацелася.

***

– Адной з дзейсных пляцовак для дыялогу з’яўляецца АБСЕ, якую неабходна сумесна падтрымаць, калі хочаце – рэанімаваць. Многія ўжо забылі, што такое АБСЕ. Мы бачым намаганні ў гэтым напрамку Генеральнага сакратара Грэмінгера, а таксама цяперашняга італьянскага старшынства ў АБСЕ. Але і яны паасобку нічога не зробяць, ім патрэбна падтрымка.



Уладзімір МАКЕЙ:
«Мы ў Беларусі маем кроўную зацікаўленасць у дыялогу, мірным вырашэнні канфліктаў»

Аб гэтым міністр замежных спраў Беларусі ***Уладзімір Макей*** *заявіў на адкрыцці ў Мінску міжнароднага форуму «Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх». І дадаў:* «Такі падыход, такое светаадчуванне выпакутаваны ўсёй нашай гісторыяй, незлічонымі стратамі ад разнастайных войнаў, якія праходзілі па нашай тэрыторыі на працягу стагоддзяў. Падзеі Другой сусветнай вайны з’яўляюцца адным з найбольш моцных, калі не самым моцным фактарам, які вызначае генетычную памяць беларускага народа і, можа, нават нацыянальную ідэнтычнасць… Праз 70 гадоў пасля завяршэння Другой сусветнай вайны нам, што называецца, і ў страшным сне не магло прысніцца, што недзе зусім побач, у непасрэдным суседстве з намі, зноў будуць весціся маштабныя баявыя дзеянні, зноў будуць гінуць мірныя людзі».



Грэмінгер заклікаў надаць палітычны імпульс Мінскім пагадненням

Томас Грэмінгер, Генеральны сакратар АБСЕ, выступаючы на форуме “Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх”, заклікаў надаць палітычны імпульс Мінскім пагадненням.

Томас Грэмінгер назваў крызіс ва Украіне самай вялікай праблемай у рэгіёне і заклікаў разам працаваць над яе вырашэннем. “Нам трэба запусціць палітычны імпульс, каб дапамагчы далей рухацца Мінскім пагадненням, – сказаў ён. – У рамках пасяджэння “нармандскай чацвёркі” можна зрабіць так, каб пачаць рухацца ў правільным напрамку».

Генеральны сакратар АБСЕ выказаў упэўненасць, што арганізацыя з цягам часу зможа прадставіць зручную платформу для дыялогу, і ў сувязі з гэтым адзначыў, што АБСЕ трэба падумаць пра “Хельсінкі-2”.

У цэлым Генеральны сакратар заклікаў усе дзяржавы да дыялогу, без якога не атрымаецца зрабіць крок наперад і пераадолець узрастаючы скептыцызм адносна існуючага парадку. Без гэтых намаганняў, упэўнены ён, можна загнаць сябе ў сітуацыю, з якой складана выйсці.

(БЕЛТА.)



Мікалай Бардзюжа:
«З пазіцыі сілы або перавагі змяніць сітуацыю ва Усходняй Еўропе да лепшага не атрымаецца»

Мікалай Бардзюжа, які займаў у 2003–2017 гадах пасаду Генеральнага сакратара АДКБ, выступаючы на форуме «Мінскага дыялогу», адзначыў актыўную пазіцыю Беларусі ў пошуку выйсця са складанага становішча ва Усходняй Еўропе.

«Беларусь зноў бярэ на сябе адказнасць за арганізацыю работы па пошуку выйсця з вельмі складанага становішча ва Усходняй Еўропе», – адзначыў Мікалай Бардзюжа. Ён звярнуў увагу, што Мінск не першы раз становіцца пляцоўкай для пошуку рашэнняў вельмі складаных знешнепалітычных праблем, у тым ліку такіх, як сітуацыя з Нагорным Карабахам, на Данбасе.

Мікалай Бардзюжа выказаў перакананасць, што для зніжэння напружанасці ва Усходняй Еўропе *«ўсе ўключаныя бакі павінны праявіць сапраўдную палітычную волю».*

Ён падкрэсліў таксама, што з пазіцыі сілы або перавагі змяніць сітуацыю ва Усходняй Еўропе да лепшага не атрымаецца.

ЗАПРАШЭННЕ

Сяргей Абламейка прэзентуе…

У аўторак 29 мая ў Мінску ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (вул. Максіма Багдановіча, 7а) адбудзецца прэзентацыя новай кнігі ***Сяргея Абламейкі* «Нечаканы Скарына»**, якая выйшла ў бібліятэчнай серыі Радыё Свабода. Пачатак у 18.30. Кнігу складаюць аўтарскае эсэ ў 25 частках «Нечаканы Скарына» і інтэрв’ю з вядомымі айчыннымі і замежнымі навукоўцамі, якія расказваюць пра навінкі скарыназнаўства. У прэзентацыі бяруць удзел ***Адам Мальдзіс, Георгій Галенчанка, Уладзімір Арлоў*** і іншыя пісьменнікі і навукоўцы.

Уваход вольны.



ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Александр ФЕДУТА

Как батюшек хотят забрить в армию

Неожиданно для всех православные и католические семинаристы, а также священники, находящиеся в призывном возрасте, лишились отсрочки по призыву на срочную военную службу. Событие для нашей страны не вполне ординарное.

В том, что неожиданный призыв семинаристов и молодых священников двух ведущих христианских конфессий полностью соответствует закону, я нисколько не сомневаюсь. И дело даже не в том, что так утверждает Министерство обороны. Сегодня Министерство утверждает одно, завтра оно может утверждать совершенно противоположное, послезавтра найдет и вовсе третий вариант – мы это уже наблюдали на примере вспыхнувшего скандала вокруг убийственной для солдат дедовщины в Печах. Просто тема слишком щекотливая, чтобы даже министр взял на себя ответственность.

Решения об отношениях государства с ведущими религиозными конфессиями принимает в нашей стране, на мой взгляд, один человек. И здесь вопрос лишь в том, зачем понадобилось пойти на такой шаг. Сегодня вопрос насчет того, чтобы указывать православным и католикам их место, приобретает некоторую остроту. Разумеется, семинаристы и молодые священники – такие же граждане страны, как и все остальные, и государство, имеющее в своем арсенале такую законодательную норму, как всеобщая воинская повинность мужского населения, вправе требовать исполнения от них гражданского долга. Но, повторюсь, есть здесь нюансы.

Все, что я сейчас скажу, – исключительно личные инсинуации, не более чем предположения, которые никак не претендуют на статус снизошедшего на колумниста откровения свыше. Так и прошу к этому относиться.

О том, что белорусское государство не слишком благоволит к действующему патриаршему экзарху всея Беларуси митрополиту Павлу, слухи ходят давно. Насколько они соответствуют истине – другой вопрос, однако игнорировать их тоже нельзя. Очевидно, что в отличие от своего предшественника владыки Филарета его высокопреосвященство Павел гораздо больше оглядывается на Чистов переулок в Москве (именно там расположена официальная резиденция главы РПЦ), чем на Дрозды, хотя географически те значительно ближе. Потому он и чувствует себя менее зависимым от белорусского государства.

В свою очередь белорусское государство не слишком готово к тому, чтобы в столь щекотливом вопросе поступаться своими законными правами. Тем более что последняя встреча лидеров ЕАЭС в Сочи продемонстрировала: Александр Лукашенко крайне неудовлетворен позицией своего российского коллеги по вопросам экономического (прежде всего) характера. Он эту неудовлетворенность высказал открыто и публично, но ответа, как мы помним, не получил. А учитывая интегрированность РПЦ в процесс принятия многих политических решений в Кремле, «напрягать» отношения с Чистовым переулком для Дроздов значит еще раз продемонстрировать Кремлю собственную независимость.

Массовый призыв будущих и действующих православных «батюшек» – как раз демонстрация независимости в принятии основных политических решений уже на собственной территории, в собственной стране. В последнее время отношения между Кремлем и Дроздами настолько охладились, что независимость можно демонстрировать и таким образом. Понятно, что вмешательства одного митрополита Павла для их «разогрева» никак не хватит. Скорее ему самому напомнят: святой отец, служить Богу в нашей стране могут исключительно ее граждане. А пока бывший митрополит Рязанский и Касимовский вроде бы не расстался с российским гражданством. Значит, вмешиваться придется уже патриарху. А за Чистовым переулком, напомним, стоит Кремль.

Католикам, как мне кажется, в данной ситуации досталось, что называется, «за компанию». В самом деле, при равной мотивированности призыва в армию призвать одних семинаристов и не призвать других – не значит ли это вступить в откровенный конфликт с той церковью, чьих служителей призвали? А так получается, что все равны не только перед Богом, но и перед государством.

Католические епископы уже отреагировали «правильно» – обратились с публичной просьбой продолжить отсрочку. Ждем православных.

ПОЗДРАВЛЯЕМ!

Она – Виктория! И это многое объясняет



Виктория Андрейчик (четвертая слева) после подведения итогов конкурса.

На международном конкурсе детского рисунка в Париже "Нарисуй мне мир!" победила одиннадцатилетняя Виктория Андрейчик из Смиловичей. В конкурсе участвовало больше тысячи детей со всего мира. Награждение проходило в Люксембургском дворце столицы, в котором, заметим, Наполеон когда-то принимал должность главы государства, а теперь заседает французский Сенат.

Стены дворца вполне соответствовали торжественному моменту: медаль, диплом и призы Вика получала из рук первого секретаря Посольства Республики Беларусь во Франции Василия Понорядова. И в тот же день юная художница вместе со своим педагогом по рисованию Еленой Карнеенко пошли в Музей современного искусства Парижа – посмотреть оригиналы Хаима Сутина. Почему именно туда? Потому что знаменитый художник тоже когда-то родился и жил в местечке Смиловичи. А сейчас там создан его виртуальный музей, а также арт-центр «Улей», где и занимается рисованием Виктория Андрейчик.

И музей, и арт-центр созданы по инициативе и финансовой поддержке «Белгазпромбанка».

Когда семье Андрейчик сообщили, что их дочке надо собираться во Францию, взрослые, что называется, присели от удивления. Хотите – верьте, хотите – нет, но мама Виктории рассказала, что девочка чуть ли не с трехлетнего возраста хотела побывать в Париже, забавляя, а то и раздражая их «глупыми» желаниями. Когда ребенок немного подрос, ему, конечно, объясняли про деньги, путешествия и мечты. Позволить себе Париж семья не могла, мама и папа Виктории работают в аэропорту рабочими.

Но у детства свои резоны. Виктория стала заниматься рисованием в арт-центре «Улей», будто чувствовала, что это самая прямая дорога в Париж. И, как видите, не ошиблась. Так что прислушивайтесь к, казалось бы, несбыточным мечтам своих детей – это могут быть настоящие планы на будущее.

Елена МОЛОЧКО.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Дык хто збіваў Сяргея Чалага?

Як раней паведамлялася, у ноч на 19 мая невядомымі быў збіты незалежны эканамічны аналітык, аўтар праграмы "Эканоміка на пальцах" партала TUT.BY **Сяргей Чалы**. Інцыдэнт адбыўся ў самым цэнтры Мінска. Пасля збіцця Сяргей апынуўся ў Бальніцы хуткай дапамогі з разбітым тварам, зламаным носам і чэрапна-мазгавой траўмай.

Некаторыя звязвалі інцыдэнт з прафесійнай дзейнасцю Чалага, але сам ён распавёў "Народнай Волі", што, хутчэй за ўсё, гэта не так.

"У мяне было ўжо вельмі шмат перадач пра эканоміку, усе яны прыкладна аднолькавай танальнасці, таму, калі б і знайшліся пакрыўджаныя, то яны праявілі б сябе значна раней", – адзначыў Сяргей.

А праз нейкі час інцыдэнт пракаментаваў і міністр унутраных спраў **Ігар Шуневіч**.

"Факт застаецца фактам – банальная п'яная бойка двух кампаній, – распавёў ён. – *Злачынства ўдалося раскрыць па гарачых слядах, дзякуючы запісам з камер відэаназірання".*

Як стала вядома, распачата крымінальная справа, чацвёра чалавек затрыманы. А Сяргей Чалы тым часам ужо выпісаўся з бальніцы.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

100 РАДКОЎ



Міхася СКОБЛЫ

Калі з'явіцца «крымскі мост» да Максіма Багдановіча?

Для Кіева Крым – украінскі, для Масквы – расійскі, а для мяне – Багдановічаўскі. Прызнаюся, перасталі цікавіць мяне вінаграднікі Масандры, крэпасць у Судаку і пісьменніцкі дом творчасці "Кактэбель", дзе неяк давялося пабываць. А вось магіла Максіма Багдановіча на старых ялцінскіх могілках – не перастала. Для мяне гэта часцінка Беларусі, гісторыка-культурная каштоўнасць, кажучы бюракратычнай мовай. І што нам сёння з гэтай каштоўнасцю рабіць?

У Крым не ходзяць мінскія цягнікі, не лятае "Белавія". Паедзеш на ўласным аўто – не факт што прапусцяць праз украінска-расійскую мяжу. А даваць кругаля праз Краснадарскі край і новазбудаваны мост цераз Керчанскую затоку таксама рызыкоўна. Па-першае, далекавата, па-другое, на тры гады можаш стаць неўязным ва Украіну.

Такім чынам Максім Багдановіч у тым Крыме стаў закладнікам украінска-расійскага канфлікту, да яго неабходна ці дарогу прабіваць, ці вызваляць яго з палону. Вось як Пуцін на "КамАЗе" эфектна праехаўся па крымскім мосце, хай бы і Аляксандр Лукашэнка на "БелАЗе" паспрабаваў знайсці які карацейшы шлях для беларусаў у Крым. Няхай бы з'явіўся і беларускі "крымскі мост" – наземны. Каб суайчыннікі і на крымскім сонцы змаглі пагрэцца (яно ж нейтральнае), і Багдановіча адведаць.

"Не прылятаюць з выраю магілы", – напісала паэтка Данута Бічэль, маючы на ўвазе магілу вялікага беларускага паэта ў Ялце. Але часам людзі ратуюць магілы ад занядбання ці знішчэння, перавозячы іх у іншае месца. Вось жа і пасля таго, як дэ-факта Крым стаў часткай Расіі, у Беларусі ізноў загаварылі пра вяртанне праху Багдановіча на радзіму.

Усё нібыта слушна. І пытанне гэтае не ўпершыню паўстае. І ўзнімалі яго ў розныя часы людзі аўтарытэтныя. Скажам, яшчэ ў 1981 годзе Зоська Верас, якая ўспрымалася ў беларускім грамадстве як ахоўніца памяці Багдановіча, звярталася з гэтай справай у Саюз пісьменнікаў. А Ларыса Геніюш тады ж, у пачатку 1980-х, у лістах да ўплывовых сяброў (Максіма Танка, Васіля Быкава, Адама Мальдзіса) прыводзіла ў прыклад культурных чэхаў: *"Я бачыла, як стварылі яны сабе пантэон на пражскім Вышаградзе. "Ač zemreli, ještě mluví" ("Хоць памерлі – яшчэ прамаўляюць") – напісана там. Быў у чэхаў найбольшы паэт-рамантык Карэл Маха. У цяжкі для іх час і ягоныя астанкі забралі ўрачыста з зямлі Судэцкай і перанеслі ў Прагу, дзе на той час абавязана быў пабываць кожны чэх. Здавалася, што браў у гэтым удзел увесь народ – так усё было ўрачыста, ахвярна. Чаму ж бы і нам не перанесці нашага Страціма-Лебедзя на ручніках бліжэй да сэрца народа?"* (ліст да А. Мальдзіса ад 17 мая 1981 года).

На жаль, перапахаванне Максіма Багдановіча, якое сапраўды магло б стаць агульнанацыянальнай акцыяй, наўрад ці магчымае. Справа ў тым, што дакладнае месцазнаходжанне магілы паэта невядомае. Няхай мяне папраўць дасведчаныя багдановічазнаўцы, але наяўныя на сёння звесткі пра месца, дзе закончыў свой зямны шлях беларускі геній, прымушаюць засумнявацца нават самых легкаверных. Магіла была згублена яшчэ ў 1920-я гады, яе нібыта потым адшукалі, але – сумненні засталіся.

А цяпер давайце ўявім, як адмыслоўцы асцярожна дэмантуюць адносна нядаўна ўсталяваны беламармуровы надмагільны помнік (рэспект Міністэрству культуры), раскапаюць магілу, а там – парэшткі не Багдановіча. Ці – увогуле няма ніякіх парэштак. І што далей? Ціхенька закапаць і вярнуць помнік на месца? Не, розгаласу пазбегнуць не ўдасца, і тады рэальная магіла Багдановіча ператворыцца ў кенатаф – сімвалічнае пахаванне.

Нічога не паробіш – магілы геніяў губляліся і ў пазнейшы час. Скажам, у расійскай Ялабузе на старых могілках шыльда паведамляе: "В этой стороне кладбища в 1941 году похоронена Марина Цветаева".

Таму прах Максіма Багдановіча ўсё ж трывожыць не варта, варта падумаць, як удаступніць для беларусаў дарогу ў няблізкі Крым. Без заезду на той спехам збудаваны крымскі мост, які ўкраінскія радыкалы ўжо збіраюцца ўзарваць...

Варта таксама годна ўшанаваць памяць пра паэта і яго родных у Беларусі. Напрыклад, у Чэрвені (былым Ігумене), дзе мясцовы краязнавец Уладзімір Дарагуш яшчэ гадоў пяць таму адшукаў магілу дзеда паэта па маці (па кудзелі, як кажуць у народзе) – Апанаса Мякоты. Ён удзельнічаў у Крымскай вайне (меў медаль), жыў у Ігумене, служыў гаспадарніком у мясцовай павятовай бальніцы, тут з жонкай Тацянай з дому Малевічаў прыдбаў сына Янку і чатырох дачок – Стэфу, Аляксандру, Ганну і Марыю – будучую маці Максіма.

Здавалася б, адшуканую магілу дзеда Багдановіча абавязкова возьме на ўлік і добраўпарадкуе Чэрвеньскі райвыканкам. На жаль, гэтага не адбылося. Прычына – няма грошай. Добра, што светлай памяці Уладзімір Дарагуш не апусціў рукі і з дапамогай сяброў зрабіў ціпліую агароджу, аднавіў крыж на помніку, ачысціў ад моху надпіс, які цяпер чытаецца даволі выразна: "З[десь] п[окоится] прахъ раба Божіего Афанасія Ивановича Мякото ум. 1878 г. 12 января".

Дзіўна, але пахаваннем Апанаса Мякоты чамусьці не заапекаваўся і дзяржаўны Музей Максіма Багдановіча. Гэта ж не з Чэрвеня, а са сталіцы – усяго з паўсотні кіламетраў...

Гэта ў несмяротных вершах унука ля магільнага склепа "амур і сумны і пригожы / стаяў з павязкай на вачах", і *"часам лёгкі пах / туды даносіўся ад ружы"*. На магіле дзеда ружы не расцуць, і яе спакой міфічныя амуры не вартуюць. Відаць, не заслужыў дваранін Расійскай імперыі *Афанасий Мякото* асобнага склепу і ганаровай варты ад тых, за каго маладым змагаўся ў Крыме. Але Апанас Мякота – дзед нацыянальнага генія Максіма Багдановіча, – бясспрэчна, мае права на нашу грамадскую і дзяржаўную ўдзячнасць. Гэта ўрэшце павінны зразумець і чыноўнікі ў Чэрвеньскім райвыканкаме.

ПРОЩАЛЬНЫЕ СЛОВА

Виктор ПИСКАРЕВ: «Мне за прожитое не стыдно…»

Вчера похоронили экс-министра внутренних дел Беларуси, генерал-лейтенанта Виктора Пискарева. Ему было 89 лет.

Виктор Алексеевич 55 лет отдал службе в милиции, 25 из них он был на генеральских должностях.

Пискарев родился 26 января 1929 года в деревне Красная Горка Юхновского района Калужской области. Выпускник Минской высшей школы МООП РСФСР (1961 г.).

«Меня направили в милицию», – рассказывал генерал в своих интервью. – *Тогда была такая практика: ЦК КПСС принимал постановление о направлении коммунистов и комсомольцев на службу в органы. В 1951-м по одному из таких постановлений меня, второго секретаря Туровского райкома комсомола, было предписано направить в управление милиции Полесья.*

Пацана с пятью классами образования назначили помощником начальника политчасти управления по комсомолу. Мне тогда было 22 года. До этого я уже несколько лет работал – токарем, электромехаником, даже председателем Туровского леспромхоза. Среднее образование получал заочно, когда уже в уголовном розыске в МВД работал, потом в Ленинграде – высшее. В Минске в это время открыли очно-заочный факультет Высшей школы МООП РСФСР. Перевелся, был одним из первых ее выпускников. Со мной учились будущий министр внутренних дел БССР Алексей Алексеевич Климовский, будущий начальник минской милиции Александр Максимович Прибытков…»

В 1980 году Пискарев с отличием защитил кандидатскую диссертацию в Академии МВД СССР.

С 1967-го по 1978 год Пискарев был начальником УВД Мингорисполкома. Почти рекорд в должности!

С 1978-го – заместитель министра внутренних дел БССР. В 1983-м – начальник главного управления ГАИ МВД СССР.

С 1984-го по 1990 год – министр внутренних дел БССР. В 2001-м избран председателем Совета Белорусской общественной организации ветеранов органов внутренних дел и внутренних войск. Заслуженный юрист Республики Беларусь.

Награжден двумя орденами Трудового Красного Знамени, Почетной грамотой Президиума Верховного Совета БССР и другими наградами.

В Верховном Совете Пискарев возглавлял постоянную комиссию по реабилитации жертв политических репрессий.

Благодаря содействию Виктора Пискарева были построены многие административные здания для служб МВД, в том числе санаторий МВД «Белая Русь», поликлиника МВД.

Виктор Пискарев был министром внутренних дел, когда в октябре 1988 года жестоко разогнали массовый митинг на День Памяти.

Зенон Позьняк говорит, что команду нейтрализовать митинг отдавал не Пискарев, а второй секретарь ЦК КПБ **Валерий Печенников**.

«Пискарев человек со здравым смыслом, – сказал Позьняк. – *Он довольно лояльно относился к Куропатам – не поддерживал, но и не наступал»*.

«Мне за прожитое не стыдно», – говорил сам Виктор Алексеевич.

Всю жизнь Виктор Пискарев прожил с женой Прасковьей Ивановной. Ласково называл ее Паша.



«Золотое правило брачной жизни – терпение и снисхождение, – говорил Виктор Пискарев в своих интервью. – *Уметь понять, уступить… Без этого никак!*

Все, что я сделал, чего добился, получилось только с поддержкой моей жены. Как говорится, жизнь пройти – не поле перейти! Я всем желаю, чтобы у каждого была такая опора и понимание! Мои успехи, карьерный рост, звания и должности стали возможны благодаря тем людям, сослуживцам, коллегам, офицерам, друзьям, которые все эти годы шли рядом со мной плечом к плечу. Я благодарю вас за все!»

Генерал Пискарев редко рассказывал о трагедии, которую им с женой довелось пережить. Они похоронили двоих сыновей. Старший сын Пискаревых Валерий, сотрудник КГБ, умер в 27 лет, младший Сергей, ученый-физик, кандидат наук – в 48…

Как пережить такое и не потерять смысл жизни, интерес? Пискарев никогда не говорил, чего ему это стоило…

До последнего дня Виктор Алексеевич Пискарев возглавлял республиканский совет Белорусской общественной организации ветеранов органов внутренних дел и внутренних войск. Причем не формально, а реально! Приходил на работу с самого утра, пешком. Проводил совещания, участвовал во всех мероприятиях по линии МВД, всегда был в курсе последних событий.

Удивительно, но факт: Пискарев, несмотря на солидный возраст, помнил имена и отчества почти всех сотрудников, с которыми когда-либо работал! С ним выходил на связь даже экс-министр **Владимир Наумов,** который, уйдя с поста министра внутренних дел, оборвал практически все контакты с ведомством, которым когда-то руководил. К Пискареву иногда заходил и генерал-лейтенант милиции **Мечислав Гриб**. К Виктору Алексеевичу обращались и «Народная Воля», когда, случалось, кое-кто из читателей необоснованно попадал под пресс правоохранителей. Авторитет Пискарева способствовал восстановлению справедливости.

«Он был талантливым, одаренным человеком, – говорит Мечислав Гриб. – *Досконально знал систему внутренних дел. И всегда делал ставку на профессионалов. В его бытность министром на должности всегда назначались управленцы, прошедшие все ступени карьерной лестницы. Пискарев большое значение придавал профессионализму кадров. Конечно, спрашивал он со всех жестко, никого не щадил. Но все было исключительно по делу и по справедливости.*

Он очень хорошо себя зарекомендовал и как руководитель организации ветеранов органов внутренних дел. Он не просто был на должности и получал зарплату, а действительно очень много делал.

Конечно, судьба у него была непростая. Потерять двух сыновей в самом расцвете лет… Для него жена и работа были смыслом жизни….

Из всего МВД я заходил только к Пискареву. И он всегда был искренне рад этим встречам. С ним можно было говорить на любые темы. Хотя активного участия в деятельности этой организации я не принимал».

Пару недель назад в день 60-летия Академии МВД Виктор Алексеевич Пискарев стал лауреатом в номинации «Имя в истории Академии МВД» вузовского конкурса «Гордость Академии». *«Пискарев был в рядах первых выпускников милицейского вуза, а точнее, на тот момент, в 1961 году, – Минского отделения факультета заочного обучения Высшей школы МВД СССР»*, – говорят в Академии МВД.

К сожалению, по состоянию здоровья Виктор Алексеевич не смог приехать на церемонию награждения.

Вчера проститься с генералом в Академию МВД пришло очень много людей, делегации приехали со всех областей Беларуси.

Похоронили генерала Пискарева на Чижовском кладбище – такова была его воля. Там похоронены два сына – Виктор Алексеевич хотел быть рядом с ними…

Марина КОКТЫШ.

АСАБІСТАЕ

«Мы – з Францішкам, і на гэтым спыняцца не збіраемся…»

Пра жыццёвыя выпрабаванні, каханне, нягоды і радасці карэспандэнту "Народнай Волі" распавялі Павел і Вольга СЕВЯРЫНЦЫ.

23 сакавіка ў сям'і палітыка Паўла Севярынца і яго жонкі Вольгі нарадзіўся сын Францішак. У кватэры, куды я наведаўся ў госці, сям'я была ў поўным складзе…

Павел: – Ужо хутка будзе дзесяць гадоў, як мы пазнаёміліся. Тады Вольга прыехала на 1-ы курс філалагічнага факультэта, мы з сябрамі ў той час якраз стваралі БХД. Праз вядомага зараз блогера Кастуся Шыталя сустрэліся на кватэры, якую здымалі Аляксей Шэін, Зміцер Дашкевіч і я. Кастусь прывёў сваіх сябровак з гістфака і філфака на прагляд фільма "Плошча". Так мы першы раз убачыліся з Волечкай. Але вяселле адбылося толькі праз пяць гадоў. Давялося адсядзець за снежаньскія падзеі 2010 года, а павянчаліся, калі выйшаў на волю, у 2014 годзе. Зараз мы ўжо з Францішкам, і на гэтым спыняцца не збіраемся.

– Дзесяць гадоў таму каханне было з першага погляду?

Павел: – Мне Волечка спадабалася адразу. Пры гэтым, як чалавек веруючы, я адразу пачаў маліцца, таму што ранейшая мая ўстаноўка была такая: ніякай жаніцьбы да перамогі. Усё было дастаткова складана, але ў рэшце рэшт Гасподзь адкрыў усё – і магчымасці, і Волечкіна сэрца.

Вольга: – А я, калі мы першы раз убачыліся, адзначыла, што Паша ў той дзень стыльна выглядаў. Быў у чымсьці чорным. І ў той момант запомніла яго вочы. Падумала: "Божа, якія прыгожыя і родныя мне вочы!" Павел тады запрасіў на курсы "Дыджэй Адраджэння", там наступны раз мы і ўбачыліся.

Павел: – Волечка на курсах была адной з найлепшых. Затым мы перасякаліся на розных культурніцкіх мерапрыемствах, пазней я атрымліваў яе лісты і перадачы ў СІЗА КДБ. Вольга, дарэчы, з'явілася на свет у Вільнюсе, падчас студэнцкіх падзей 1991 года, калі Літва абараніла сваю незалежнасць. Там у свой час жылі і працавалі яе бацькі.

– Вольга, а як бацькі паставіліся да вашага выбару?

Вольга: – Паколькі Паша цесна звязаны з палітыкай, то я спачатку даволі асцярожна распавядала пра яго. Вось, маўляў, ёсць такі цудоўны чалавек, але пры гэтым не казала, што мы сустракаемся. Баялася іх рэакцыі. Але калі Пашу вызвалілі, то ўжо давялося пазнаёміць, куды ж падзецца? І калі прыехалі да бацькоў, то тыя літаральна за пяць хвілін закахаліся ў Пашу, і ўсе пытанні былі зняты.

– Яны не цікавяцца палітыкай?

Вольга: – Скажам так: нас падтрымліваюць, але з некаторай асцярогай ставяцца да гэтай тэмы. Ужо была гісторыя, калі я запісалася ў БХД і на матулю пачалі аказваць ціск. Яна тады вельмі перажывала, натуральна, што ад гэтага было балюча і мне.

– Сапраўднае выпрабаванне, напэўна, было і ў той час, калі пасля снежаньскіх падзей Паўла адправілі на "хімію" ў Купліне…

Вольга: – Памятаю, рабіла блінчыкі, якія вельмі любіў Паша, і прывозіла на спатканні. Ён быў на "хіміі" ў інтэрнаце, але наведвальнікаў пускалі на нейкі час для сустрэч з сябрамі і блізкімі, дазвалялі ў альтанцы пасядзець.

Павел: – Некалькі гадзін удавалася паразмаўляць. Можа быць, сілавікі разлічвалі суцішыць маю палітычную актыўнасць праз сустрэчы з каханай. Маўляў, глядзіш, справа дойдзе да вяселля – перастану займацца палітыкай… Але мы гэта паспяхова пераадолелі.

– А і насамрэч не было думкі ажаніцца ў Купліне?

Павел: – Мы ж веруючыя людзі, вянчанне для нас было і ёсць галоўным у справе шлюбу. А ў Купліне наўрад ці магчыма было павянчацца. Таму вырашылі дачакацца вызвалення.

Вольга: – Я лічыла дні, спадзявалася, што Пашу вызваляць раней часу, і для гэтага былі некаторыя перадумовы. Але ўсе яны не спраўдзіліся.

– Ці абмяркоўвалі, якім будзе ваша вяселле?

Вольга: – Безумоўна, у нас было некалькі месяцаў на падрыхтоўку. Хацелі запрасіць як мага больш гасцей, падрыхтавалі для іх падарункі.

Павел: – А ў кватэры, якую я здымаў, зрабілі табло і вялі зваротны адлік дзён, якія заставаліся да вяселля. Дарэчы, прапанову зрабіў прыкладна за год да гэтай падзеі. Ехаў з Купліна ў Віцебск праз Мінск, было трохі часу, каб сустрэцца з Волечкай. Падарыў ёй пярсцёнак і альбом, які зрабіў з дапамогай матулі. Тая прыехала ў Куплін і на дарозе да царквы сфатаграфавала мяне з літарамі, якія складаліся ў выраз "Волечка, каханая, ці ты выйдзеш за мяне?"

– Вось гэта падарунак!

Вольга: – Паша ведае, што я люблю, а таму да гэтага часу дорыць самыя розныя рэчы – пачынаючы з кніг і заканчваючы жаночымі халацікамі. Пра кветкі нават няма чаго казаць, іх я атрымліваю раз на месяц дакладна. А я стараюся таксама дарыць яму тое, што ён любіць. На першыя тры дні нараджэння дарыла яму па кнізе трохтомнага гістарычнага атласа, а пасля, калі тамы скончыліся, былі ў падарунак хрысціянскія кнігі.

Павел: – На гадавіну вяселля мы традыцыйна ходзім у кавярню. Раз на год дазваляем сабе такую раскошу. Выбіраем нейкае знакавае месца ў Траецкім прадмесці альбо ў Верхнім горадзе і там адзначаем дату. Гэтым разам, відаць, давядзецца ісці разам з Францішкам.

– Павел, вы былі халасцяком са стажам – ажаніліся, здаецца, у 37 гадоў…

Павел: – Скажу шчыра, бацькі не маглі дачакацца маёй жаніцьбы. Сябры пыталіся: "Паша, калі?.." І вось прыйшоў час, з'явілася Волечка. Жаніцца – гэта было рашэнне паміж мной і Богам.

– А як жа прынцып "ніякай жаніцьбы да перамогі"?

Павел: – Воля і перамога не супярэчаць адна адной, а ідуць побач. Для сябе гэтую задачу я вырашыў так.

– Ці складанымі былі першыя дні ў сямейным жыцці?

Павел: – Для мяне самым складаным была падрыхтоўка і чаканне вяселля, таму што жыццё навучыла заўсёды рыхтавацца да горшага. Таму настройваў сябе на тое, што трэба будзе ламаць пасля жаніцьбы свой працоўны графік, абмяжоўваць нейкія звычкі. Я рыхтаваўся да складанасцяў, бо ведаеце ж, колькі фальклору ходзіць у народзе пра шлюб і сямейнае жыццё.

Але на самай справе ўсё аказалася інакш. Я зразумеў, што шлюб – гэта цуд Божы, магчымасць узаемнай дапамогі. Насамрэч з'яўляецца больш часу для творчасці, праца робіцца больш плённай. Хаця я ўмею жыць адзін, але, калі працаваць побач з цудоўным, прыгожым чалавекам, які цябе кахае, натхняе і падтрымлівае, то гэта толькі патройвае сілы.

– Хатнія абавязкі вы ў сям'і як размеркавалі?

Павел: – Мы бралі за аснову класічны варыянт, калі ўнутры, у доме большасць рашэнняў прымае Волечка, а знешняе – мая сфера. Хаця дапамагаем адзін аднаму. Жонка, напрыклад, рыхтуе розныя мерапрыемствы лепш за мяне, а я магу ў той жа час памыць посуд альбо пагушкаць Францішка.

– Некалькі год таму Вольга напісала кранальную гісторыю пра тое, як у вас нарадзіўся сын Янка, але, на жаль, пражыў усяго некалькі дзён…

Вольга: – У мяне было ўнутранае адчуванне, што гэта трэба распавесці людзям.

Павел: – Янка нарадзіўся з рэдкім захворваннем – сіндромам Патау. Складанасці пачаліся ўжо на першым ультрагукавым даследаванні, калі адразу ж даведаліся пра хваробу. Мы шмат маліліся, але адразу для сябе прынялі рашэнне, што будзем паступаць так, як павінны паступаць вернікі. Лічылі, што калі дасць Бог, то прымем дзіцятка, якое б яно ні было. Ніякіх абортаў рабіць не будзем. Але атрымалася так, што Янка прабыў з намі толькі восем дзён. Пасля гэтага Волечцы было вельмі цяжка…

– Дарэчы, а як урачы паставіліся да вашага рашэння?

Вольга: – Сустрэлі толькі двух дактароў, якія ў той момант нас падтрымалі. Нават калі прыехала ў радзільны дом, у мяне здзіўлена пыталі, чаму не пагадзілася на аборт. Псіхалагічна гэта быў складаны момант, таму што практычна ў кожным кабінеце трэба было тлумачыць сваё рашэнне: аборт – гэта забойства ненароджанага дзіцяці.

Павел: – З дактарамі і насамрэч было даволі складана. Але ж мы разумеем, што і Яначка, і Францішак – гэта ад Бога. Гасподзь дае, а калі трэба, то і забірае. Мы не наракаем на Бога, і, думаю, у нас яшчэ будзе шмат дзетак і шмат шчаслівых гісторый.

– 23 мая Францішку спаўнілася ўжо два месяцы. Дарэчы, ведаю, што Павел прысутнічаў на родах…

